На адной хвалі

# ЧАС СПРАЎДЖВАЦЬ МАРУ

**Галоўны медыяхолдынг краіны праводзіць набор слухачоў на навучальныя курсы тэлерадыёвядучых па адукацыйнай праграме «Спецыфіка работы тэлерадыёвядучага».**

Для тых, хто заўсёды марыў аб прафесіі вядучага, з'явілася выдатная магчымасць рэалізаваць сваё жаданне. Вядомыя выкладчыкі, вядучыя і рэпарцёры пазнаёмяць слухачоў курсаў са светам тэлебачання, падзеляцца прафесійнымі сакрэтамі. Яшчэ вас чакаюць заняткі па тэхніцы маўлення, асновам акцёрскага майстэрства і тэлерадыёжурналістыкі, будзе таксама практыка работы ў студыі, у тым ліку і з тэлесуфлёрам.

Працягласць навучання — 3-4 месяцы. Пачатак заняткаў будзе вызначаны пасля таго, як сфарміруецца група. А на выхадзе выпускнікі атрымаюць даведкі аб адукацыі дзяржаўнага ўзору.

Да навучання запрашаюцца прэтэндэнты ва ўзросце ад 18 да 40 гадоў. Каб запісацца на курсы, патрэбна запоўніць анкету (бланк якой можна знайсці на сайце Белтэлерадыёкампаніі) і запісаць відэаролік з расповедам пра сябе працягласцю да адной хвіліны. Анкеты і відэавізітоўкі дасылайце на адрас электроннай пошты: kursyBT@yandex.by. А дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефоне (8017) 389-63-34.

**Алена ДРАПКО.**

# ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 216

4—12.04.2024 г. адбыліся чэмпіянаты краіны па шашках-100 (Вышэйшая ліга). У мужчын была вельмі напружаная барацьба, нікому з удзельнікаў не ўдалося пазбегнуць паражэння. Да апошняга тура не было зразумела, хто ўвойдзе ў тройку прызёраў. Міжнародны гросмайстар Яўген Ватуцін, які перамог у апошнім туры, другі год запар стаў чэмпіёнам краіны. На другім месцы — міжнародны майстар Аляксей Куніца. «Бронзу» заваяваў міжнародны гросмайстар Сяргей Насевіч. Залаты медаль у жанчын выйграла майстар Вікторыя Нікалаева, якая захапіла лідарства з першага тура. На другім месцы — Паліна Петрусёва, якая адстала ад чэмпіёнкі на адно ачко. Трэцяй фінішавала майстар Яўгенія Швед. Цікава, што ў жанчын гэта быў ужо юбілейны 50 чэмпіянат. Пачынаўся ён у дзень юбілею шматразовай чэмпіёнкі свету Алены Ратковіч (Альтшуль), а заканчваўся ў дзень нараджэння экс-чэмпіёнкі свету Людмілы Сахненка (Ільной). Абедзве спартсменкі ў мінулым былі лідарамі беларускіх шашыстак.

13—14.04.2024 г. у мінскай СДЮШАР па шахматах і шашках адбыўся XV адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-64 памяці шматразовага чэмпіёна Беларусі М. С. Гелера. У турніры ўзяў удзел 31 шашыст, сярод якіх пяць міжнародных гросмайстраў на чале з дзейным чэмпіёнам свету Андрэем Валюком. Перамог міжнародны гросмайстар Уладзіслаў Валюк.

**№ 64**




**№ 64** В. Варушыла — А. Куніца

**Белыя простыя:** a1, c1, g1, b2, e3, g3, h4, a5 (8).

**Чорныя простыя:** a3, d6, h6, a7, c7, b8, d8, h8 (8).

Чорныя адчуваюць цяжкасці з уводам у гульню шашкі h8, таму гросмайстар палічыў за найлепшае фарсіраваць нічыю 1...d6-e5 (пагроза ef4+) 2. e3-d4 e5:c3 3. b2:d4 h6-g5 4. h4:f6 d8-e7 5. f6:b6 a7:e3 6. a5-b6 h8-g7 7. g3-h4 g7-f6 8. b6-a7 f6-e5 9. h4-g5 e5-d4 10. g5-f6 d4-c3 11. f6-e7 c3-d2 12. e7-d8 d2-e1 13. d8-a5 e1-g3 14. a5-e1 g3-c7. Белыя планавалі забраць шашку e3 ходам 15. e1-f2, аднак заўважылі e3-d2! 16. c1:e3 c7-a5 =.

**№ 65** В. Варушыла — І. Драгун

**Белыя простыя:** c1, e1, g1, b2, d2, f2, h2, a3, e3, f4 (10).

**Чорныя простыя:** h4, a5, c5, g5, h6, a7, c7, b8, d8, f8 (10).

1. b2-c3 a7-b6? [нельга 1... d8-e7? бо ўслед рушыць разгромны ўдар 2. f2-g3 h4:b2 3. e1-f2 g5:e3 4. f2:a1x ] 2. f4-e5! f8-g7 3. e5-f6 g7:e5 4. c3-b4 a5:c3 5. d2:f4+.

**№ 66** М. Тараніна — Г. Буйліна

**Белыя простыя:** 42, 45, 38, 39, 33, 35, 26, 21, 16 (9).

**Чорныя простыя:** 22, 23, 24, 17, 11, 12, 13, 7, 10 (9).

Чорныя правялі ўдар «Масток». Знайдзіце яго самастойна.

**№ 67** В. Арцюхін (Мінск)

**Белыя простыя:** e1, g1, b2, d2, c3, e3, g3, f4 (8)

**Чорныя простыя:** a3, a5, e5, d6, h6, c7, e7 (7)

**№ 68** В. Марцінкевіч (Глыбокае)

**Белыя простыя:** c1, a3, e3, g5, h6 (5).

**Чорныя простыя:** d2, g3, f4, a5, d6 (5).

**№ 69** Ю. Голікаў (Цвер)

**Белыя простыя:** d2, f2, g3, d6, c7 (5).

**Чорныя простыя:** d4, f4, a5, e5, g5, g7, b8 (7).

**№ 70** Г. Андрэеў (Латвія)

**Белыя простыя шашкі:** a1, b2, f2, a3, d4, c5, h6, e7 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** e3, b4, h4, a5, d6, g7, f8 (7).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні. Выпуск № 215 ад 12.04.2024 г.

**№ 56** 1. d6-c7 b4-c3 2. d2:d6 f6-e5 3. f2-g3 h4:d4 4. f4-g5 h6:f4 5. c7-d8 e5:c7 6. d8:f8 +

**№ 57** 1. e5-f6 c3:g7 [ 1...g3:g7 2. e1:g3 h2:f4 3. e7-f8 c3:e5 4. f8:c5 e5-f4 5. c5-f2 f4-g3 6. f2:h4 ] 2. e7-f8 g3:e5 3. e1:g3 h2:f4 4. f8:c5 e5-f4 5. c5-f2+

**№ 58** 1. e5-d6 c3:c7 [ 1...g3:c7 2. e1:g3 h2:f4 3. e7-f8 c3:e5 4. f8:b8 e5-d4 5. b8-f4 d4-c3 6. f4-c1 ] 2. e7-f8 g3:e5 3. e1:g3 h2:f4 4. f8:b8 e5-d4 5. b8-f4 d4-c3 6. f4-c1+

**№ 59** 1. 29-23 28:10 2. 25:05 39-43 3. 48:39 37:48 4. 05:37 48:45 5. 37-48 26:37 6. 48:01+

**№ 60** 1. 35-30 40:49 2. 30-24 19:30 3. 27-21 16:27 4. 32:14 49:05 5. 37-32 05:37 6. 48-42 37:48 7. 46:37 48:31 8. 26:37+

**№ 61** 1. c7-b8 b4-c3 [ 1...g7-f6 2. g5:e7 b4-c3 3. b8-e5 d4:d8 4. b2:d4 ]

2. c1-d2 a3:e3 3. g5-f6 g7:e5 4. b8:b4 d4-e3 5. b4-e1+

**№ 62** 1. g5-h6 g7-f6 2. c1-d2 a3:c1 3. e3-f4 c1:g5 4. h6:b8+

**№ 63** 1. d6-e7 b8:f8 2. f4:d6 a5:e5 3. a7-b8 h6:f4 4. h4-g5 f4:h6 5. b8:d6 h2:f4 6. d6:g3+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

Пішыце на адрас: газета *«Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013*

*e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**







Жыццё ў стылі эка

# ПОСУД ДЛЯ ПІКНІКА



**Да майскіх свят ужо рукой падаць. На небе сонейка пяшчотнае зіхаціць, дрэвы маладзенькай лістотай гамоняць, траўка зялёная вабіць пабегаць. Самы час пікнік зладзіць: чыстым паветрам падыхаць, а можа, і шашлыкі-каўбаскі пасмажыць. Толькі які посуд на стол ставіць? Аднаразовы пластыкавы?**

На першы погляд у паходах на прыроду ён вельмі зручны: танны, лёгкі, можна не мыць — выкарыстаў і выкінуў на сметнік. Праўда, з пункту гледжання здароўя і навакольнага асяроддзя выбар так сабе. Пластык няпроста ўтылізаваць, ды і вырабляецца ён далёка не з бясшкодных матэрыялаў: полікарбанату (маркіроўка PC), полістыролу (PS), полівінілхларыду (PVC) і іншых. Найбольш небяспечная тара (звычайна вырабы з маркіроўкай PVC і PC) змяшчае бісфенол. Ён асабліва шкодны пры цяжарнасці, бо зніжае ў плацэнце ўзровень серataніну, неабходнага для развіцця мозгу эмбрыёна.

Многія віды пластыку пры награванні вылучаюць таксіны (фталаты, фармальдэгіды, полікарбанаты і інш.), якія назапашваюцца ў арганізме і выклікаюць парушэнні сэрца, нервовай сістэмы, нырак, печані, а таксама спрыяюць развіццю ракавых пухлін. Таму пластыкавы посуд, за выключэннем поліпрапіленавага, не прызначаны для напояў і ежы з тэмпературай вышэй за 80 °С. Яго нават у гарачай вадзе мыць не варта. Не рэкамендуецца таксама пакідаць на сонцы або каля агню — пранікненне таксінаў у прадукт павялічваецца ў дзясяткі разоў. Таму прыгатаванае мяса і астатнія стравы лепш класці на керамічны, драўляны або металічны посуд.

**Александрына ПАРШЫНА.**




**Падрабязней аб тым, які пластык з'яўляецца найбольш бясшкодным і якую тару неабходна выкарыстоўваць узамен, а таксама іншыя цікавыя экапарады чытайце ў часопісе «Родная прырода». Падпісацца на яго можна па індэксах 74926 (інд.) і 749262 (ведам.):**

- ✓ **праз аддзяленні сувязі «Белпошта» і на сайце Belpost.by;**
- ✓ **праз сістэму Belpressa.by;**
- ✓ **праз аўтаматызаваную сістэму АРІП;**
- ✓ **у магазінах і павільёнах «Белдрук».**




Нашы рубрыкі:
Зялёная школа • Экатурызм • Экамайстэрня • Біяразнастайнасць
Дзівоснае – побач • Чырвоная кніга • Экатэхналогіі • Зялёная аптэка

| Падпісныя індэксы: | Цана, руб. за месяц | за квартал | за паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 74926 – для індывідуальных падпісчыкаў | 18,53 | 55,59 | 111,18 |
| 749262 – для ведамасных падпісчыкаў | 24,95 | 74,85 | 149,70 |

Афарміць падпіску на часопіс можна:
• праз аддзяленні сувязі «Белпошта» і на сайце Belpost.by;
• праз сістэму Belpressa.by;
• праз аўтаматызаваную сістэму АРІП;
• у магазінах і павільёнах «Белдрук».